2. Иностранный язык. Специализированная лексика [Электронный ресурс] : учеб.-метод. комплекс по учебной дисциплине для всех специальностей первой ступени высшего образования университета / Белорусский государственный университет культуры и искусств, Факультет информационно-документных коммуникаций, Кафедра белорусской и зарубежной филологии; сост.: С. Г. Безмен [и др.]. – Электронные текстовые данные. – Минск, 2022. – 418 с. – Режим доступа: http://hdl.handle.net/123456789/25471. – Дата доступа: 23.08.2022.

3. *Майоршина, С. В.* Проблемы и перспективы преподавания ESP в вузе (на примере географического факультета МПГУ) [Электронный ресурс] / С. В. Майоршина // Наука и школа. – 2017. – № 3. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/problemy-i-perspektivy-prepodavaniya-esp-v-vuze-na-primere-geograficheskogo-fakulteta-mpgu. – Дата доступа: 23.09.2022.

УДК [008+930.85]:001.891.3(476)

***В. М. Белакурскі,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін;*

***Ж. Я. Белакурская,***
*кандыдат філалагічных навук,*
*дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый і рэкламы*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», г. Мінск, Беларусь*

# ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ ЯК ФЕНОМЕН КУЛЬТУРЫ

**Анатацыя.** У артыкуле вылучаюцца найбольш актуальныя і дыскусійныя аспекты разгляду феномена гістарычнай памяці як важнай культуралагічнай катэгорыі: вызначаецца паняцце «гістарычная памяць», аналізуецца праблема суадносін гісторыі і памяці, пытанне аб захаванні гістарычнай памяці беларускага народа ў сучасных умовах. Аўтарамі акрэслены асноўныя тэндэнцыі развіцця даследаванняў гістарычнай памяці з другой паловы XX ст. да нашых дзён. Засяроджана ўвага на своеасаблівасцях падыходаў даследчыкаў да асэнсавання і вырашэння дадзенай праблемы.

**Ключавыя словы:** беларускае грамадства, вобразы мінулага, памяць, гістарычная памяць, нацыянальная ідэнтычнасць, нацыянальная самасвядомасць, нацыянальная культура.

***V. Belakurski,***
*PhD in Philosophy, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Social Disciplines;*
***Zh. Belakurskaya,***
*PhD in Philology, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Intercultural Communications of the Educational Institution "The Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

## HISTORICAL MEMORY AS A CULTURAL PHENOMENON

**Abstract.** The article highlights the most relevant and debatable aspects of considering the phenomenon of historical memory as an important cultural category: the concept of "historical memory" is defined, the problem of the relationship between history and memory is analyzed, as well as the issue of preserving the historical memory of the Belarusian people in modern conditions. The authors outline the main trends in the development of historical memory studies since the second half of the 20th century. to the present day. Attention is focused on the features of researchers' approaches to understanding and solving this problem.
**Keywords:** Belarusian society, images of the past, memory, historical memory, national identity, national identity, national culture.

Феномен гістарычнай памяці паўстае адной з маладаследаваных сфер грамадскай свядомасці. Разам з тым без глыбокага асэнсавання, якім чынам адбываецца дэтэрмінацыя нацыянальнай культуры гістарычнай памяццю народа, сёння немагчыма аніякае сацыякультурнае праектаванне і прагназаванне. Уплыў гістарычнай памяці на культуру мае таксама практычнае вымярэнне, звязанае з неабходнасцю аптымізацыі сучаснай сацыяльнай практыкі, выпрацоўкі дзяржаўнымі ўстановамі навукова абгрунтаваных рашэнняў, высвятлення сацыяльнага самаадчування беларускага грамадства, садзейнічання захаванню апошнім сваёй культурнай ідэнтычнасці. Яшчэ адной прычынай выступае актуальная патрэба зберагання цэласнасці айчыннай духоўнай прасторы, выпрацоўкі ўстойлівага імунітэту супраць пагрозы разбурэння існуючай культурнай ідэнтычнасці. Сёння «пазітыўны вобраз мінулага здольны аказаць значнае стымулюючае ўздзеянне на фарміраванне жыццёвых стратэгій розных сацыяльных груп, выступіць у якасці адной з вядучых рухаючых сіл развіцця краіны ў XXI стагоддзі» [1, с. 58]. Менавіта таму зварот да рэтраспектыўнага модусу павінен надаць сучаснаму чалавеку пэўную сацыяльна-анталагічную

ўстойлівасць, звязаную з надзейнымі арыенцірамі ў культурнай ідэнтыфікацыі, камунікатыўных сувязях, асабістых паводзінах і інш.

Апошнія дзесяцігоддзі XX – пачатак XXI ст. былі азнаменаваны глыбокімі пераменамі ў структуры, змесце і метадалогіі сацыяльна-гуманітарных ведаў. У дадзенай сувязі вывучэнне гістарычнай памяці заявіла аб сабе як адносна самастойны даследчы напрамак. Даволі шырокае прызнанне ў сучасных навукоўцаў атрымалі працы французскага даследчыка першай паловы XX ст. М. Хальбвакса, які вельмі змястоўна прааналізаваў механізм фарміравання калектыўнай гістарычнай памяці асобных сацыяльных груп [2]. Галоўнай ідэяй у аўтара выступала думка, што памяць уяўляе сабой не адназначна індывідуалізаваныя працэсы захавання і перапрацоўкі суб’ектам атрыманых уяўленняў, на самай справе ў большай ступені яе дзейнасць вызначаецца грамадствам. Успаміны аб мінулым закранаюць не толькі аднаго чалавека, але і ўсё грамадства. Яны замацоўваюцца ў памяці і перадаюцца ад таго ці іншага члена дадзенай супольнасці да шматлікіх камунікантаў, ствараючы тым самым своеасаблівы сацыяльна-мемарыяльны каркас гістарычнай памяці ўсяго народа. Дзякуючы гэтаму разгортваецца больш сістэматызаваная рэканструкцыя гістарычнага мінулага дадзенага грамадства.

Суайчыннік М. Хальбвакса П. Нора схіляўся да супрацьпастаўлення памяці і гісторыі, падкрэсліваючы: «Памяць – гэта абсалют, а гісторыя ведае толькі адноснае» [3, с. 20]. У Францыі пад кіраўніцтвам П. Нора нават была зроблена спроба рэалізацыі праекта «Месцы памяці», дзе дамінантамі мінулага паўсталі гістарычныя асобы, месцы, рэчы, падзеі, рытуалы, сімвалы і традыцыі: Жанна д’Арк, Нотр-Дам, Пантэон, Трыумфальная арка, Вялікая энцыклапедыя Ларуса – універсальны энцыклапедычны слоўнік выдавецтва «Ларус», Сцяна камунараў і інш. «Месцы памяці, – падкрэсліваў аўтар, – нараджаюцца і жывуць дзякуючы адчуванню, што спантаннай памяці няма, а гэта сведчыць, што патрэбна ствараць архівы, патрэбна адзначаць гадавіны, арганізоўваць святкаванні, ґаварыць пахавальныя прамовы, натарыяльна завяраць акты, таму што такія аперацыі не з’яўляюцца натуральнымі» [Там жа, с. 26].

Сёння ў навуковых даследаваннях сустракаюцца даволі розныя тлумачэнні паняцця «гістарычная памяць»:

– спосаб захавання і трансляцыі мінулага (адсюль імкненне навукоўцаў да стварэння такіх праектаў, як «Месцы памяці» ў Францыі);

– адно з вымярэнняў індывідуальнай і калектыўнай памяці, сімвалічная рэпрэзентацыя мінулага;

– шэраг падзей, успаміны аб якіх захоўвае нацыянальная гісторыя;

– адлюстраванне ў грамадскай свядомасці вельмі значнай і актуальнай інфармацыі аб мінулым у цеснай сувязі з сучаснасцю і будучым;

– апорныя пункты масавых ведаў аб мінулым, мінімальны набор вобразаў, падзей і асоб мінулага, якія прысутнічаюць у актыўнай памяці народа;

– сукупнасць уяўленняў аб грамадскім мінулым, якія існуюць у соцыуме як на масавым, так і на індывідуальным узроўні, утрымліваючы ў сабе кагнітыўны, вобразны і эмацыянальны аспекты.

Значная частка сучасных даследчыкаў пад гістарычнай памяццю імкнецца разумець пэўную сукупнасць данавуковых, навуковых, квазінавуковых, пазанавуковых ведаў, а таксама масавых уяўленняў таго ці іншага соцыуму аб сваім агульным мінулым. Гістарычная памяць уключае звесткі пра знакамітыя ў гісторыі грамадства падзеі, дзейнасць выдатных асоб, былыя традыцыі, маральныя нормы, рэлігійныя і культурныя рытуалы і інш.

Аналіз пытання дэтэрмінацыі сацыяльнай рэчаіснасці гістарычнай памяццю прадугледжвае паглыбленне ў сам яе феномен. Перш за ўсё засяродзім увагу на гістарычнай памяці як на своеасаблівай інтэлігібельнай прасторы, што надзяляе чалавечую існасць сімваламі, арыенцірамі і сэнсамі. Гаворка ідзе пра так званыя ўрокі гісторыі, якія стымулююць пэўныя настроі, а тым самым памкненні індывідаў і сацыяльных груп у сваю гістарычную будучыню. Напрыклад, этычнае вымярэнне гістарычнай памяці не толькі ўтрымлівае ў сабе патрабаванне вернасці «гераічнаму мінуламу» беларускага народа, але і фармулюе сёння абавязкі адказных адносін да яго. Важна адзначыць пры гэтым, што гістарычная памяць прадугледжвае самарэфлексію соцыуму як адзінага цэлага і выступае важнай часткай яго духоўнай культуры. Глыбіня гістарычнай памяці ў поўнай меры вызначае здольнасць нацыянальнай самасвя-

домасці беларусаў рэагаваць на сацыякультурныя трансфармацыі і ўзнікненне новых рэалій культуры, падвяргаючы крытычнаму аналізу сутнасць, маштабы і значнасць тых змен, якія сёння адбываюцца ў свеце постмадэрну. Экспансія апошняга на Захадзе правакуе страту нацыямі гістарычных арыенціраў, «размытасць» вобразаў мінулага, адсутнасць культурных прыярытэтаў і стратэгічных кірункаў.

Неабходна нагадаць і тое, што ў наш час адбываецца своеасаблівая віртуалізацыя гістарычнай памяці. Сродкі рэтрансляцыі апошняй выйшлі на прынцыпова новы ўзровень, што прывяло да стварэння вялікай колькасці розных вэб-сайтаў, мэта якіх – не толькі актуалізаваць, але і трансфармаваць падзеі мінулага. Таму аналіз асаблівасцей і вынікаў фарміравання гістарычнай памяці ў рэжыме анлайн патрабуе сёння больш пільнай увагі як з боку даследчыкаў, так і грамадства.

Гістарычная памяць паўстае адным з найважнейшых фактараў фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці. «Менавіта сіла памяці вызначае рысы ідэнтычнасці і робіць мінулае праекцыяй будучага» [2, c. 48–49]. Яна можа выразна заявіць аб сабе ў кантэксце цвярозага асэнсавання соцыумам не толькі сваёй гісторыі, але і канкрэтнага становішча грамадства, яго магчымых і жаданых перспектыў. Нацыянальная ідэнтычнасць з'яўляецца своеасаблівым імператывам у час выбару народам шляхоў свайго развіцця.

Такім чынам, гістарычная памяць выступае як актыўны сацыякультурны працэс, дзякуючы якому ідэнтычнасць кожнага соцыуму падтрымліваецца пры дапамозе рэканструкцыі мінулага шляхам нейтралізацыі яго супярэчлівых версій. У сваю чаргу, рэканструктыўны характар гістарычнай памяці яскрава сведчыць аб значнай ролі імпліцыраваных у ёй аксіялагічных ідэй, а таксама цеснай сувязі «ведаў аб мінулым» з сучаснасцю.

1. *Мысливец, Н. Л.* Историческая память: актуальность исследования и необходимость сохранения / Н. Л. Мысливец // Беларус. думка. – 2022. – № 2. – С. 56–62.

2. *Рюзен, Й.* Кризис, травма и идентичность / Й. Рюзен // «Цепь времен»: проблемы исторического сознания. – М., 2005. – С. 38–62.

3. Франция – память / П. Нора [и др.]. – СПб. : Изд-во С.-Петерб. ун-та, 1999. – 328 с.

4. *Хальбвакс, М.* Социальные рамки памяти / М. Хальбвакс ; пер. с фр. и вступ. ст. С. Н. Зенкина. – М. : Новое изд-во, 2007. – 348 с.